Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 20 (1289) | ПАНЯДЗЕЛАК, 26-га студзеня 1931 г.

ІНФОРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

20—24 студзеня 1931 году адбыўся чарговы пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Пленум разглядзеў пытаньні: 1) аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год: 2) аб соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі і веснавой пасеўнай кампаніі; 3) аб рабочым забесьпячэньні і аб рабоце спажывецкай кооперацыі і 4) інформацыйнае паведамленьне Наркамгандлю аб ходзе загатовак.

Пастановы, прынятыя пленумам па гэтых пытаньнях, будуць апублікаваны ў друку.

Пленум аслабаніў тав. Сянькевіча ад абавязкаў члена бюро ЦК згодна яго заявы.

Склад членаў бюро ЦК КП(б)Б папоўнены т.т. Чарнушэвічам і Кавальчуком, якія адначасова зацьверджаны членамі сакратарыяту ЦК КП(б)Б. Кандыдатамі ў члены сакратарыяту ЦК КП(б)Б зацьверджаны т.т. Гурыновіч і Палякоў.

МАЦАВАЦЬ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНУЮ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ЗГУРТАВАНАСЬЦЬ У БОЙКАХ ЗА ПЕРАМОГУ КОМУНІЗМУ

Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы комсамолу

Даклад тав. КАГАНОВІЧА на IX зьезьдзе УсеЛКСМ*)

…выць палітыку ня толькі ў рэзолюцыях

У …ерамозе цяжкасьцяй нашага бу… …тва вялікае значэньне маюць …ьні організацыйнага парадку. …с сустракаецца няўменьне орга… …аць працу, няўменьне організа… …і актыўнасьць мас і падабраць …і. Само сабою зразумела, што …зды рэволюцыі мы з вамі на …і вырасьлі. Мы ўмеем організа… …мільёны. Але наша ўменьне трэба …раць не абсолютна, а адносна і ў …наньні з тымі патрабаваньнямі, …на нас прад'яўляюцца з кожным …. Мы павінны так паставіць сваю …ізацыйную працу, каб яна пад… …зала палітыку, каб яна праводзіла …цьцё дырэктывы, якія мы даем, …к тым, гэтага ў нас на цяпераш… …тады не заўсёды хапае. Возь… …мыя вострыя пытаньні—пытань… …бясьпечаньня і работы коопэ….

…о-ж выкрываецца? Выкрываецца …што дырэктывы партыі выкон… …ла яшчэ дрэнна. Наяўныя тавары, …у нас ня так мала, мы ня ўмеем …як трэба выкарыстаць. Аказваец… …то гэтыя тавары застаюцца і па… …оць ня туды, куды патрэбна. …заецца, што шкоднікі засылалі ў …і ня тыя тавары, якія там па… …ы. Але-ж для таго, каб разабрац… …тым, што непатрэбна пасылаць …авых гальштукаў у Казакстан, …йшая асьвета не патрэбна. Не, …атрэбна проста ўменьне, удумчы… …падыход, уменьне організаваць …зу. Патрэбна ўмець ня толькі …аць рэолюцыю, але ўмець на …тыцы змагацца з шкоднікамі. Зла… …яго ня толькі тады, калі яго вы… …а ДПУ, але злавіць яго рукамі …калі ён шкодзіць.

…ія комсамольскіх ячэек у коопэ… …і, у органах забясьпечаньня над… …айна вялікая. Комсамольцы орга… …оць лепшыя брыгады. Добра, …ж у вас ёсьць ячэйкі ў гэтых …ах. Трэба ўзмацніць іх працу і …асьць. Комсамол па іней пранік… …ва ўсе поры, ва ўсе шчыліны, …сапраўды вокам, памоcнікам пар… …каб бачыць усе недахопы, якія …ца, і своечасова сыгналізаваць …. Трэба ўсвоіць, што рашучым …яецца зараз уменьне організа… …працу зьверху да нізу па пра… …аму ажыцьцяўленьню нашых па… …оў. На раёвых конфэрэнцыях, …Масквы я прыводзіў шэраг …ладаў, як няўменьне орга… …аць маецца і ўнізе. Вось мы …указаньне—організуй разьмер… …ьнік, а прыходзіш у разьмерка… …нік і бачыш, што там чорт ведае, …робіцца, рабочыя лаюцца, бо …на організавана справа. І гэта …е толькі таму, што рэзолюцыю …аюць, а вось залезьці ў разьмер… …ьнік, у склад, пад паліцу, пагля… …ь, як там хаваюцца тавары, буль… …і не засьмярдзела рыба, як яе …ваць, каб рабочы без чаргі атры… …пролукты,—вось гэтай справай …аюцца мала.

…эба ўмець скарыстаць ініцыятыву …і. Самакрытыка ў нас разгарну… …як ніколі. Задача наша, аднак …з у тым, каб мы здолелі ўсе пра… …вы, якія ідуць па лініі самакры… …, конкрэтна ператварыць у жыцьцё. …ста сэкратар ячэйкі, сэкратар …амолу, старшыня завкому выстаў… …ь на паказ свае дасягненьні ў …й галіне:—„У нас,—кажа адзін,— …аводзе тысяча прапаноў паступі… …Другі гаворыць—1300, трэці га… …іць—у мяне 1500. А пытаньне …з у тым, колькі прапаноў праве… …а ў жыцьцё, і як яны праведзе… …Лётаюць па ўсіх цэхах, як быц… …сьпяшаюцца кудысьці, замест та… …каб узяць адзін цэх, адну групу …авесьці там працу да канца, а по… …соўвацца далей.

…на работніца на тэкстыльнай фаб… …ы скардзілася:—„Што-ж гаворыць яна,—рацыяналізатарскія мерапрыемствы праводзяць гэта добра, але вось я трэці тыдзень б'юся, у мяне на машыне вінт расхістаўся, я прашу яго паправіць, а да мяне прыбяжыць хто-небудзь, паглядзіць, пакачае галавой і скажа:—„Але, але зараз зраблю" і пабяжыць далей. Праз два дні зноў прыбяжыць, і зноў—„але, але, зараз зраблю" і зноў бяжыць. А каб узяць і зрабіць адразу, і лепш-бы праца пашла".

Трэба ўмець організаваць масы на конкрэтнай справе, зьвязваючы гэтыя конкрэтныя пытаньні з палітыкай. Зразумела, прыдзірчывы чалавек можа сказаць, што гэта дзяляцтва, да дзяляцтва клічаш. Глупства! Палітыка заключаецца ў тым, каб яе тварыць ня толькі ў рэзолюцыях (рэзолюцыя —справа добрая, ідэйная чыстата патрэбна, змагацца за яе трэба). Але мы разьбілі правых, трэба з імі весьці барацьбу і далей, трэба быць дбайнымі, але трэба барацьбу з правым опортунізмам перанесьці ў штодзённае жыцьцё, у штодзённую практыку, павесьці барацьбу з няўменьнем працаваць, падшукаць людзей і кадры, падымаць іх на ўсё большую і большую вышыню і організоўваць масы вакол конкрэтных задач.

Нам патрэбен інжынэр-організатар, а не „чалавек з дыплёмам"

Пытаньне аб кадрах—адно з цэнтральных пытаньняў. Цэнтральны Камітэт партыі гэтаму пытаньню ўдзяліў выключную ўвагу. Тут комсамол павінен граць вялізарную ролю. Проблема кадраў для комсамолу, падрыхтоўка кадраў, выхаваньне іх на ўсіх галінах работы, пачынаючы ад гаспадарчых устаноў, канчаючы заводам, цэхам, зьяўляецца аднэй з цэнтральных задач. Комсамол павінен падрыхтаваць кадры для сябе, для сваёй работы, у асаблівасьці для вёскі. З комсамолу мы павінны чэрпаць кадры для дзяржапарату і гаспадарчага будаўніцтва. Мы маем сярод комсамольцаў шмат здольных, таленавітых організатараў, якіх можна паставіць памоцнікамі дырэктароў, членамі праўленьняў, а затым яны пойдуць і далей. У асаблівасьці гэта адносіцца да колгасаў і саўгасаў дзе нашы кадры яшчэ вельмі слабыя.

Вось зараз ідуць перавыбары саветаў. Партыя паставіла задачай правесьці перавыбары саветаў такім чынам, каб яны паслужылі штуршком для карэннага палепшаньня работы саветаў і дзяржапарату, для павароту саветаў тварам да колгасаў, тварам да вытворчасьці, для таго, каб саветы сталі на чале спаборніцтва і ўдарніцтва. Ва ўсёй гэтай перавыбарчай кампаніі комсомол павінен адыграць ролю ня толькі як сілы, дапамагаючай партыі організаваць масы, але і як орга нізацыі, якая можа высунуць сотні і тысячы малалых здольных рабочых і колгасьнікаў у саветы. І комсамол, які мае 3 мільёны, а піонэрская організацыя 4 мільёны,—7 мільёнаў чалавек, вось гэта—тая армія, якая будзе будаваць комунізм, вось гэта—тая армія, якая павінна дапамагчы і дапаможа партыі хутчэй дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны (воплескі).

IV. Масавая работа, комсамол і партыя

За чыстату ленінскай ідэолёгіі

Нашы цяжкасьці зьвязаны з абвостраньнем клясавай батацьбы. Вы ведаеце, што па гэтаму пытаньню, па карэннаму пытаньню рэволюцыі правыя опортуністыя прапаведвалі лібэральную, немарксысцкую, ня ленінскую лінію. Мы бачым на прыкладзе „Прампартыі", кулацкай партыі, меншавіцкіх організацый, як пры падтрыманьні сусьветнага капіталізму гэтыя людзі імкнуліся сарваць соцыялістычнае будаўніцтва. Вось чаму мы пры перамаганьні нашых цяжкасьцяй павінны праяўляць асобую клясавую дбайнасьць, мы павінны змагацца за чыстату ідэолёгіі. Выхаваньне рабочай масы, выхаваньне колгасьніка з пункту гледжаньня клясавай дбайнасьці зьяўляецца галоўнейшым пытаньнем.

Ленін на III зьезьдзе комсамолу разгарнуў шырокую програму выхаваньня моладзі. Ён гаварыў у 1920 годзе.

„Комуністычны Саюз моладзі толькі тады апраўдае сваё званьне, што ён ёсьць саюз комуністычнага маладога пакаленьня, калі ён кожны крок свайго навучаньня, выхаваньня, адукацыі будзе зьвязваць з удзелам у агульнай барацьбе ўсіх працоўных супроць эксплёататараў".

(У. Ленін. Аб маладым пакаланьні. Комуністычнае выхаваньне моладзі, стар. 21)

На працягу 10 год комсамол ажыцьцяўляў запаветы Леніна, ён вучыўся, ён, вучачыся, змагаўся, змагаючыся вучыўся. Ён вырас у шматмільённую організацыю і вырас ня толькі колькасна, але і якасна.

І як далёка наш комсамол адышоў ад высунутай у свой час тав. Бухарыным задачы, як галоўнай задачы, барацьбы з курэньнем, прывіваючы комсамолу зацікаўленасьць літаратурай нат-пінкертонаўскага характару! „Патос" барацьбы з курэньнем, „патос" нат-пінкертонаўскай літаратуры заменен сапраўдным патосам рэволюцыйнай романтыкі барацьбы за тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, за вывучэньне кантрольных лічбаў, за вывучэньне пацігодкі. Да рэчы, і аб пяцігодцы ёсьць ужо кнігі, якія чытаюцца, як лепшая романтычная літаратура, як, напрыклад, кніга Ільліна аб пяцігодцы. Гэта—лепшая захапляючая кніга, у якой комсамолец бачыць, як мы расьцем, якія вялікія багацьці ў нас ёсьць і якія каштоўнейшыя, грандыёзьнейшыя пэрспэктывы адкрываюцца перад нашай краінай, перад кожным рабочым і селянінам. Тав. Сталін яшчэ ў 1925 годзе ставіў задачы выхаваньня моладзі, як задачу падрыхтоўкі барацьбітоў за перамогу соцыялізму ў нашай краіне.

„А што значыць выхоўваць моладзь у духу ленінізму? Гэта значыць, папершае, укараняць у яе сьвядомасьць таго, што перамога соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне магчыма і неабходна. Гэта значыць, па-другое, умацоўваць у ёй упэўненасьць у тым, што наша рабочая дзяржава ёсьць дзіця міжнароднага пролетарыяту, што яна ёсьць база разгортваньня рэволюцыі ва ўсіх краінах, што канчатковая перамога нашай рэволюцыі зьяўляецца справай міжнароднага пролетарыяту. Гэта значыць, па-трэцяе, выхоўваць моладзь у духу давер'я кіраўніцтву комуністычнай партыі. Трэба стварыць у комсамоле такія кадры і такі актыў, якія-б маглі правесьці выхаваньне моладзі менавіта ў гэтым напрамку. Трэба, каб кожны комсамолец актывісты зьвязаў сваю штодзённую працу ва ўсіх галінах будаўніцтва з пэрспэктывай пабудовы соцыялістычнай грамады" (Сталін. „Пытаньні ленінізму", стар. 291).

Прасякнуць інтэрнацыяналізмам працу комсамолу

Вялікае значэньне мае нацыянальнае пытаньне і інтэрнацыянальнае выхаваньне моладзі. На гэтым пытаньні буржуазія іграла. Гэта пытаньне служыла бруском, на якім расколвалі моладзь.

Тав. Сталін ставіў важнейшай задачай інтэрнацыянальнае выхаваньне моладзі:

„Інтэрнацыяналізм зьяўляецца асноўнай ідэяй, якая прасякае работу комсамолу. Патрэбна, каб нашу рэволюцыю навучыліся разглядаць комсамольцы не як самамэту, а як сродак для перамогі пролетарскай рэволюцыі ва ўсіх краінах".

(І. Сталін. Пытаньні ленінізму. Стр. 291).

Барацьба за моладзь, барацьба за ідэйны ўплыў, барацьба за піонэраў мае выключнае значэньне ў сучасны пэрыод.

Мы павінны вучыць комсамольцаў ленінізму, мы павінны вучыць таму, што мы ўступілі зараз у пэрыод соцыялізму, і гэты пэрыод соцыялізму патрабуе новага ўменьня працаваць новай ідэйнай вышыні, гэта патрабуе вялікай вытрымкі. Мы перажываем першую стадыю соцыялізму і апошнюю стадыю НЭП'у. Гэта не азначае, што ў нас клясавая барацьба спыняецца. Тая акалічнасьць, што мы ліквідуем кулака як клясу, ня значыць, што ў нас будзе адразу ліквідавана кулацкая, буржуазная ідэолёгія. Яна жывучая і мы будзем мець неаднаразовыя спробы ўплываць на рабочую клясу, на комсамол.

Сваім ідэйным выхаваньнем мы павінны глыбей пранікнуць у школы і піонэрскія атрады. Нам трэба дабіцца, каб школу сапраўды політэхнізаваць, бо яна ў нас далёка яшчэ не перабудавана.

У комсамоле ня месца „лявацкім" спортыўным практыкаваньням

Комсамол у барацьбе за кіраўніцтва, у барацьбе за ідэйную чыстату сваёй лініі паказаў сябе вытрыманай бальшавіцкай, ленінскай організацыяй. Гэта на працягу апошніх год асабліва адчувалася. Зіноеўская троцкісцкая опозыцыя была і ў комсамоле. Мы мелі ў комсамоле і правых ухілістых. Барацьба ў партыі з гэтымі ўхіламі згуртоўвала і комсамольцаў. Комсамол з такой-жа энэргіяй і сілай павінен весьці барацьбу з правай небясьпекай, як і з троцкісцкай опозыцыяй. У комсамоле, больш чым у партыі, былі спробы прывіўкі „лявацкіх" ухілаў. Моладзь, якая менш мае жыцьцёвага вопыту і клясавай барацьбы, да яе лягчэй падкрадваецца опортуністы пад „левай" маскай і пачынае ў яе ўліваць опортуністычныя погляды.

Троцкі пачаў сваю барацьбу з проціпастаўленьня комсамолу партыі. Па сутнасьці оправы гэта прабавалі паўтараць Шацкін і яго сябра Ломінадзэ, і, мала маючы з комсамолам агульнага, „тэорэтык" Стэн—намесьнік Гегеля на зямлі (Сьмех).

Яны знашлі саюзьніка ў асобе Сырцова і разам з ім селі ў вялікую галёшу (бурныя воплескі). Гэтыя гора-опозыцыянэры" організавалі блёк і задумалі весьці барацьбу з партыяй. Комсамол на чале са сваім ЦК у барацьбе з гэтымі імкненьнямі „левакоў" уплываць, расстройваць яго шэрагі паказаў сябе ў асноўнай сваёй масе як пасьлядоўная, баявая ленінская організацыя, якая змагалася за лінію партыі і яе ЦК (воплескі). Партыя будзе і надалей весьці рашучую барацьбу на два фронты, і комсамол як і раней будзе ў перадавых шэрагах барацьбітоў за лінію партыі. Партыя атрымала перамогу над усімі опозыцыйнымі групамі, і тыя, хто цкаваў партыю на працягу шэрагу год, аказаліся простымі моськамі, якія брахалі на сланя. У гэтых людзей нічога ня вышла, бо жыцьцё разьбіла іх.

Недалёк той час, калі мы дагонім і перагонім Амэрыку

Калі мы некалькі год назад павінны былі тэорэтычна даводзіць правільнасьць нашай генэральнай лініі партыі, то сёньня кожны мала-мальскі сьвядомы пролетары ўпэўнен на практыцы ў правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі.

Партыя перамагла таму, што ЦК цьвёрда і няўхільна стаяў на ленінскім шляху (воплескі) і таму, што правадыром нашай партыі зьяўляўся лепшы праваднік ідэй Леніна—т. Сталін (працяглыя воплескі) (Выклікі: „Няхай жыве т. Сталін—правадыр сусьветнага комунізму"! „Няхай жыве правадыр комуністычнай партыі тав. Сталін"! Ура! Бурныя воплескі" Зьезд устае і наладжвае овацыю тав. Сталіну).

Кіраўніцтва партыі прывяло да максымальнага выкарыстаньня ўсіх магчымасьцяй нашай соцыялістычнай сыстэмы гаспадаркі. Мы выправілі і ўкладнілі пяцігодку; мы разьбілі шкоднікаў і зараз сваімі кадрамі будуем фундамэнт соцыялістычнай экономікі. Кожны рабочы ведае, што партыя і яе ЦК цьвёрда вядуць краіну да поўнай перамогі соцыялізму. Сёньня мы практычна паказалі ўсяму сьвету, што нашы магчымасьці становяцца сапраўднымі. што мы ўступілі ў пэрыод соцыялізму. Гэта накладае на нас шмат абавязкаў па перамозе цяжкасьцяй, якія перад намі стаяць.

Мы ведаем, таварышы, што калі сёньня ў нас ёсьць цяжкасьці забясьпечаньня, дык к канцу пяцігодкі кожны рабочы можа быць цьвёрда ўпэўнен, што мы дамо ўдоваль насельніцтву сала, масла, усе патрэбныя продукты.

Рабочы ведае, за што змагаецца (Воплескі). Кожны рабочы ведае, што калі сёньня мы яшчэ не дагналі і не перагналі буйныя капіталістычныя краіны, дык конец пяцігодкі і першыя годы новай пяцігодкі пакажа ўсяму сьвету, што мы дагонім і перагонім ПАЗШ. Ці давядзем мы да канца пасьпяхова гэтую справу, справу будаўніцтва соцыялізму, цяжкую справу барацьбы за сусьветны комунізм? Тут мала аднэй упэўненасьці, мала аднаго тэорэтычнага прагнозу. На гэта адказваюць мільёны ударнікаў соцыялістычнага спаборніцтва сваёй організаванасьцю, сваёй сілай удару па клясаваму ворагу.

Наперад за партыяй, за яе ЦК, і вы будзеце гаспадарамі сьвету

Падлічваючы свае сілы на фронце барацьбы з ворагамі як унутры, так і звонку, мы гаворым масам: Мы цьвёрда ўпэўнены ў сваёй перамозе. Наша армія расьце з кожным днём усё больш і больш. Наша армія—рабочая кляса, колгасьнікі, батрацтва серадняцкія масы і рэволюцыйныя рабочыя ўсяго сьвету, якія ідуць з намі.

Нашы організаваныя сілы—гэта 11 млн. членаў профсаюзу, 9 млн. членаў двух добраахвотных таварыстваў —ТДАвіяхэму і Мопр'у, больш мільёна дэпутатаў у саветы, мільёны ахопленых соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, 3 мільёны комсамольцаў, 4 млн. піонэраў. Кіраўніком усёй гэтай арміі зьяўляецца лепшая ў сьвеце пролетарская партыя, якая налічвае каля 2 млн. чалавек у сваіх шэрагах —наша комуністычная партыя бальшавікоў.

Уся гэта армія на чале са сваім Ленінскім ЦК дае нам поўную ўпэўненасьць у тым, што соцыялізм будзе пераможцаю (воплескі).

Таварышы комсамольцы і піонэры! Вы ішлі за партыяй. Разам з ёю вы атрымоўваеце адну перамогу за другой. Ні кроку назад. Наперад за сваю родную бальшавіцкую партыю, за яе Цэнтральны Камітэт, і вы будзеце гаспадарамі ўсяго сьвету! (Бурныя працяглыя воплескі. Усе дэлегаты ўстаюць. Крыкі „Ура!", „Інтэрнацыянал". Выкрык —„Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт партыі!", Крыкі:— „Слава", „Слава"! Бурныя воплескі).

*) Канец. Пачатак у папярэдніх №№ „Ч. З."



СЛУХАЙ, УКРАІНА,—выклікаем на спаборніцтва!

Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады высоўвае шэраг буйнейшых задач па ўмацненьню фінансавай сыстэмы, забясьпячэньню высокіх тэмпаў сац. будаўніцтва шляхам стварэньня значнага дзяржаўнага грашовага рэзэрву. Фінансавы плян зьяўляецца адным з зьвеньняў у нашай барацьбе за соц. наступленьне па ўсім фронце, за выкананьне пяцігодкі ў 4-тыры гады.

Асаблівае значэньне для стварэньня фінансавай базы і забесьпячэньня поўнага выкананьня фінпляну мае мобілізацыя вольных сродкаў працоўнага насельніцтва.

Улічваючы,

што ашчадкасы займаюць надзвычайна адказнае месца ў агульнасавецкай сыстэме, як масавы крэдытны апарат, на які ўскладзена адказнейшая задача па зьбіраньню вольных сродкаў, ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе камітэты і ячэйкі прыняць адпаведныя захады, каб павысіць удзел комсамолу ў разьвіцьці ашчадсправы, каб ён выканаў устаноўленыя ўрадам кантрольныя лічбы фінпляну, асабліва на вёсцы, як вельмі адсталай, якая патрабуе сталай дапамогі з боку комсамольскай арганізацыі і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

ЦК ЛКСМБ для практычнага вырашэньня гэтай важнейшай задачы ад імя ўсіх комсамольскіх арганізацый Беларусі выклікае на соц. спаборніцтва комсамольскія арганізацыі Украіны і бярэ на сабе наступныя абавязкі

1. Вылучыць

на сталую працу ў ашчадны апарат ня менш 600 комсамольцаў.

Вылучэньне правесьці на працягу 1931 г. па ўзгадненьню ЦК з Кіраўніцтвам ашчадкасамі. Апошняе бярэ на сабе абавязак належнай падрыхтоўкі вызначаных таварышоў.

2. У мэтах актывізацыі комсамольскіх арганізацый на працы па ашчадсправе ЦК абавязваецца сіламі РК і нізавых комсамольскіх ячэек уцягнуць у ашчадкасы 4,5 млн. руб. фізычных укладаў якія разьмяркоўваюцца між асобнымі гарадзкімі і раённымі камітэтамі і даводзіцца да кожнай нізавой ячэйкі на падставе папярэдняга абгаварэньня, вызначаючы заданьне на бюро ячэек і агульных сходах з метай арганізацыі сустрэчнага пляну.

Гадовае заданьне разьбіваецца на квартальныя і месячныя. Разьбіўка заданьня на каляндарныя тэрміны ўтвараецца гар. і райкамамі.

3. Каб выканаць заданьне і наогул разьвіць ашчадсправу, ЦК абавязваецца правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) праводзіць праз комсамольскія арганізацыі агітацыйна растлумачальную працу сярод працоўных гораду і вёскі з метай уцягнуць іх укладчыкамі ашчадкас, для чаго павінны быць скарыстаны ўсе належныя магчымасьці.

Комсамольцы—

агітатары падтрымліваюць сыстэматычную сувязь з адпаведнымі ашчадкасамі і камісіямі садзейнічаньня, прымаючы ўсе меры да іх актывізацыі;

б) комсамольскія ячэйкі арганізуюць шэфства над мясцовымі ашчадкасамі, наставіўшы яго на практычныя рэйкі, шэфства павінна вылівацца ў сыстэматычнай сувязі з ашчадкасай, праверцы яе працы і практычнай дапамозе ёй, для чаго трэба выдзяляць агітатараў, арганізоўваць вярбоўку ўкладчыкаў праз падворныя абходы і выдзяленьне ўдарных брыгад, заслухоўваць справаздачы ашчадкас і прымаць меры каб зьнішчыць недахопы і перамагчы цяжкасьці, якія сустракаюцца ў працы;

в) улічваючы надзвычайную важнасьць соцсектару вёскі, як апорнага пункту для разьвіцьця ашчадсправы сярод асноўнай масы сялянства, комсамольскія арганізацыі павінны прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі камсадаў у колгасах і разгортваньні іх работы, для чаго ў склад камсаду павінны быць вылучаны актывістыя з комсамолу;

г) выходзячы з таго велізарнага значэньня, якое маюць безнаяўныя разьлікі для дзяржавы і працоўных, вылучыць актывістых для популярызацыі безнаяўных разьлікаў на прадпрыемствах і ўстановах, ствараючы з іх кадры, якія-б інструктавалі і дапамагалі рабочым запаўняць бланкі загадаў па безнаяўных разьліках і карыстацца імі.

Практычна

дапамачы ашчадкасам як найхутчэй увесьці безнаяўныя разьлікі на масавых плацяжох насельніцтва ва ўсіх гарадох БССР і больш буйных раённых цэнтрах, а таксама прыняць актыўны ўдзел у організацыі і правядзеньні безнаяўных разьлікаў на вёсцы;

д) пры правядзеньні масавай і індывідуальнай працы па ашчадсправе і інш. галінах работы ашчадкас, паставіць задачу ахапіць на працягу 1-га кварталу 1931 г. 100 проц. комсамольцаў ашчадкасамі з тым, каб яны сталі прыкладам у адносінах сталага карыстаньня паслугамі ашчадкас і безнаяўнымі разьлікамі;

4. Організаваць

на працягу 1931 г. ня менш 50 новых комсамольскіх аддзяленьняў, вылучыўшы ў гэтыя аддзяленьні найбольш актыўных таварышоў. Забясьпечыць у новых і раней організаваных комсамольскіх аддзяленьнях прыкладную пастаноўку работы, як з пункту погляду абслугоўваньня кліентуры, так і ў адносінах агіт. растлумачальнай працы. Мясцовыя комсамольскія організацыі павінны аказваць комсамольскім аддзяленьням асаблівую ўвагу ў сэнсе сталай дапамогі стварэньню кадру актывістых і г. д.

5. Улічваючы надзвычайную важнасьць належнага абслугоўваньня шырокіх працоўных мас ашчадкасамі, організаваць сталы грамадзкі кантроль над іх працай праз „ЛК“, комсамольцаў, рабкораў і інш.

6. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на асьвятленьне працы ашчадкас у ЦО ЦК—„Ч. З.“, побач з сыстэматычным асьвятленьнем працы комсамолу ў галіне выкананьня фінпляну ашчадкас.

7. Прыцягнуць да працы па ашчадсправе піонэрскія організацыі, як для ўплыву на сваіх бацькоў, так і для практычнага ўдзелу ў выкананьні паасобных заданьняў,

Правесьці

сярод піонэраў адпаведную растлумачальную работу аб значэньні ашчадсправы і задачах піонэрорганізацыі. Устанавіць сувязь піонэрорганізацыі з ашчадкасамі, выпрацаваўшы сумесна конкрэтныя формы і мэтады работы.

8. У час правядзеньня ашчадапаратам усялякіх кампаній (месячнік зьберажэньняў, рэалізацыі пазыкі, мэтавыя накапленьні і інш.) комсамольскія організацыі прымаюць актыўны ўдзел у кампаніі, вылучаючы ўдарныя брыгады, дакладчыкаў актывістых, організоўваючы налёты „ЛК“, шырока асьвятляючы ход кампаніі і работу ашчадапарату і грамадзкасьці ў оргáне ЦК—„Ч.З“.

На падставе генэральнага дагавору, РК і ГК, супольна з мясцовымі ашчадкасамі, распрацоўваюць конкрэтныя пляны ажыцьцяўленьня дагавору ў кожным раёне і горадзе. Ня менш аднаго разу за паўгода на старонках ЦО організуецца агляд працы паасобных комсамольскіх організацый у галіне выкананьня фінпляну ашчадкас.

Для праверкі

выкананьня дагавору заслухоўваюцца даклады нізавых ячэек, на ЦК—даклады райгаркомаў, праз вылучэньне спэцыяльных брыгад, выезды прадстаўнікоў ЦК на месцы, а таксама штомесячную інформцыю рай і гаркомаў па гэтаму пытаньню.

Для праверкі выкананьня соцумовы, пэрыодычна склікаць сумесныя нарады комсамолу з ашчадкасамі, на якіх заслухоўваць даклады аб ходзе выкананьня. Вылучыць тры прэміі лепшым ячэйкам і камітэтам, якія выявілі асаблівую ініцыятыву ў выкананьні соц. умовы.

ЦК ЛКСМБ

ВЫКЛІКАЕМ НА[...]

Комсамолія БССР бярэ аба[...] на соцыял[...]

Соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам узьн[...]

4.500.000 павінны быць дадзены

З пастановы Бюро ЦК ЛКСМБ

1. Адзначыць, што ў паасобных гарадох і раёнах (Віцебск, Дуброўна, Полацак, Пухавічы і інш.) ёсьць некаторы зрух у галіне ўдзелу комсамольскай організацыі ў працы па мобілізацыі сродкаў і разгортваньні ашчадсправы. Адначасова з гэтым, шэраг раённых і гарадзкіх організацый комсамолу (Менск, Сьмілавічы, Расна, Сіроціна і інш.) недаацанілі палітычнага сэнсу мобілізацыі сродкаў, разьвіцьця ашчадсправы, удзелу ў гэтай працы комсамолу і не прыступілі да правядзеньня гэтай працы.

Палітычная недаацэнка і бязьдзейнасьць шэрагу комсамольскіх організацый у выкананьні важнейшай дырэктывы кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б, пастановы ЦК КП(б)Б і і пастановы ЦК комсамолу зьяўляюцца недапушчальнымі і павінны разглядацца, як праява правага опортунізму на практыцы.

2. Узятыя комсамолам Беларусі абавязацельствы ў галіне разьвіцьця ашчадсправы (уцягненьне ў 1931 г. 4,5 міл. укладаў у ашчадкасы, вылучэньне 600 комсамольцаў на сталую працу ў ашчадапарат, адчыненьне 50 комсамольскіх аддзяленьняў ашчадкас, шэфства нізавых ячэек над ашчадкасамі, організацыя ўдарных брыгад і інш.) патрабуюць актыўнай і штодзённай працы комсамольскай організацыі па выкананьню гэтых задач.

Выходзячы з гэтага і з задач па ажыцьцяўленьню соцумовы з комсамолам Украіны, бюро ЦК пастанаўляе:

1. Мобілізаваць увагу комсамольцаў і працоўнай моладзі вакол поўнага выкананьня фінпляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі ў першым квартале г. г. забясьпечыць поўнае выкананьне кантр. заданьня і компэнсаваць недавыкананьне заданьняў асобнага кварталу.

2. Неадкладна абгаварыць соцумову з комсамолам Украіны на бюро і сходах ячэек з шырокім прыцягненьнем беспартыйнай рабочай і сялянскай моладзі.

Пры абгаварэньні соцумовы забясьпечыць організацыю сустрэчнага пляну, як у адносінах вызначанага для кожнага камітэту і ячэйкі заданьня, так і высоўваньня ў парадку ініцыятывы новых мерапрыемстваў, накіраваных на выкананьне соцумовы і пастановы ЦК комсамолу ад 27-XI-30 г. Усю працу праводзіць шляхам шырокага разгортваньня соцспаборніцтва [...] ўдарніцтва паміж ячэйкамі, райкома[...] і гаркомамі.

3. Усім райкомам, гаркомам і ні[...]вым ячэйкам праверыць ахоп комс[...]мольцаў пазыкай, укладчыкамі ашча[...]кас і карыстаньня безнаяўнымі раз[...]лікамі, дабіўшыся на працягу 1-[...] кварталу 1931 году 100 проц. ахо[...] комсамольцаў укладчыкамі ашчадк[...] праводзячы гэту працу пад лёзунга[...] „Ніводнага комсамольца без ашча[...] кніжкі“. „Кожны комсамолец—агі[...]тар за ашчадсправу і вярбоўшчы[...] укладчыка“.

4. Для стварэньня сталага ко[...]самольскага актыву вакол пра[...] ашчадкас, усім райкомам, гаркома[...] ячэйкам вылучыць комсамольцаў-а[...]татараў з такім разьлікам, каб на ко[...]ным прадпрыемстве, у колгасе, саўг[...]се, вёсцы і ўстанове было-б ня ме[...] аднаго комсамольца-організатара аш[...]справы.

5. Вылучэньне 600 комсамольцаў [...] сталую працу ў ашчадапарат пр[...] весьці на працягу 1931 году. Лічы[...] неабходным пачаць падрыхтоўку пе[...]шай групы з 100 комсамольцаў [...] пазьней 15-II г. г.

6. Пашырыць практыку шэфс[...] нізавых комсамольскіх ячэек [...] ашчадкасамі, асабліва на вёсцы, [...] даўшы яму характар сталай практ[...]най дапамогі ў працы ашчадкас і гр[...]мадзкага кантролю над імі.

7. Адчыненьне новых 50 ком[...]мольскіх аддзяленьняў ашчадкас пр[...]весьці ў асноўным на працягу 1-г[...] 2-га кварталу г. г.

8. ЦБ ДКА забясьпечыць акты[...] ўдзел піонэрорганізацыі ў популяр[...]зацыі ашчадсправы, безнаяўных ра[...]лікаў і дапамогі ў выкананьні аба[...]зацельстваў, узятых комсамолам.

9. Для сталай праверкі і кіраўні[...] працай ячэек і практычнай дапа[...] стварыць пры райкомах і гарко[...] па вопыту паасобных організацый Дуброўна, Віцебск, ініцыятыў[...] тройкі па ашчадсправе, усклаўшы [...] пасрэднае кіраваньне сэктарам [...] аднаго з членаў бюро.

10. Устанавіць штомесячную інф[...]мацыю райкомамі, гаркомамі ЦК [...] ходзе выкананьня соцумовы з ком[...]молам Украіны і пастановы ЦК.

Сакратар ЦК ЛКСМБ—ПЭРЛІН[...]

Комсамольскую ініцыятыву— на рэалізацыю швэйных машын

Вызначаная па Беларусі контрольная лічба рэалізацыі швэйных машын знаходзіцца пад сур'ёзнай пагрозай зрыву. На 1- студзеня гэтага году з 12347 машын было рэалізавана толькі 6110, што складае 50 проц. Рэалізацыя машын першых 12-ці катэгорый канчаецца праз тыдзень, а між тым гэтых машын засталося нерэалізаваных звыш 200 штук. Па некаторых раёнах (Мазыр, Лоеў, Карма, Нараўляны і інш.) к 1-му студзеня было рэалізавана ня больш 4—5 проц. Гэтыя „посьпехі“ ствараюць пагрозу зрыву выкананьня пляну мобілізацыі сродкаў па Беларусі.

Да канца кампаніі застаўся толькі месяц. Яго трэба скарыстаць для ліквідацыі прарыву, для сапраўды пасьпяховага сканчэньня кампаніі.

Комсамольцы павінны ўзяцца за гэтую справу. Узяць пад кантроль працу ашчадных кас, жорстка б[...] па нядбайных адносінах працаўні[...] кас да рэалізацыі швэйных маш[...] па іх бясчынных, марудных, чар[...] нашых тэмпах.

Пры актыўнай дапамозе ком[...]самолу, Беларусь зможа і па[...]вінна выканаць дадзенае [...] заданьне.

Б. К[...]



Бюро ячэйкі ашчадкас г. Менску абгаварвае соцдагавор

Ня спыняцца на паўдарозе

Пастанова ЦК комсамолу ўзварушыла Пухавіцкую комсамольскую організацыю, якая да гэтага часу нічога не зрабіла па ашчадсправе.

Райком разьмеркаваў кантрольныя лічбы ўкладаў па ячэйках. На сталую працу ў ашчадапарат вылучаны 2 комсамольцы.

Організавана брыгада комсамольцаў, якая накіравана ў вёскі. Частка брыгады ўжо вярнулася, уцягнуўшы 50 укладчыкаў на 400 р.

Характэрна адзначыць, што комсамольскую брыгаду, якая зьявілася ў Шацкі сельсавет, скарысталі на іншай працы. Старшыня сельсавету заявіў: „У нас больш важныя справы—ашчадсправа можа і пачакаць“.

Зараз перад Пухавіцкай організацыяй стаіць задача ўсямернага паглыбленьня і пашырэньня свайго ўдзелу ў ашчадсправе.

ЛЯВЕНКА.

…СОЦСПАБОРНІЦТВА КОМСАМОЛ УКРАІНЫ

…вязак мобілізаваць 4,5 мільёнаў вольных сродкаў насельніцтва …сычнае будаўніцтва трэцяга рашаючага году

…ым ініцыятыву працоўных мас—выканаем і перавыканаем узятыя абавязкі перад партыяй і краінай

ПРЫКЛАД ВІЦЕБСКУ--усёй організацыі

…цыялістычны дагавор комсамо… …ел…русі з комсамолам Украіны …ногага абавязвае комсамол у га… …яго практычнага ўдзелу ў вы… …ньні фінпляну ашчадкас і разь… …ці ашчад-справы.

Багаты вопыт

…рапа, праведзеная Віцебскай …нізацыяй паказвае, як павінна …аваць комсамольская організа… …на важнейшым вучастку фін… …у—ашчадсправе.

…шчадкасы Віцебску працавалі …увагі з боку грамадзкасьці. …ананьне фінпляну за мінулы …і асобны квартал было сарвана. …мечанасьць ашчадапарату, рвац… …настроі, адарванасьць ад рабо… …масы, адсутнасьць рабочага …тролю і цьвёрдага кіраўніцтва …абавалі тэрміновага ўмяшаньня …адзкасьці на гэтым вучастку …раты.

…іцебскі комсамол да пастановы …ЛКСМБ таксама ня прымаў …лу ў мобілізацыі сродкаў праз …адкасы.

…рактычныя мерапрыемствы, пра… …еныя віцебскім комсамолам на …цягу сьнежня месяцу, унесьлі …нны пералом у працы ашчад… …ў адносіны да іх грамадзкасьці …сцовых організацый.

Мобілізавалі 100

…ытаньне аб удзеле комсамолу …азьвіцьці ашчадсправы абмяр… …валася на бюро Гаркому, пленуме …гарадзкім активе організацыі. …усіх ячэйках гораду былі пра… …ены сходы, прысьвечаныя гэтаму …аньню. Больш 100 комсамольцаў… …гадзіраў, праінструктаваныя і …сьпечаныя выпрацаванымі тэзі… …ы і памяткамі, былі кінуты …прадпрыемствы і ячэйкі для …вядзеньня растлумачальнай пра… …і дапамогі нізавым організацыям. …омсамольскія брыгады ў сваёй …цы ня былі абмежаваны тэрмі… …і да поўнай рэалізацыі выне… …ых Гаркомам і ячэйкай рашэнь… …замацоўваліся за прадпрыемст… …і.

…рыгады на мясцох прыцягвалі …працы ня толькі комсамольскія …йкі, а проф'ячэйкі, камсоды, у …іку ашчадсправа заняла адпа… …нае месца ў працы гэтых орга… …зацый. Брыгады на мясцох сустрэ… …я з фактамі, калі рабочыя ня ведалі аб безнаяўных разьліках і значэньні ашчадсправы (Аўтобаза № 1).

Ішлі штурмавыя брыгады

Брыгады выявілі, што на шэрагу прадпрыемстваў (ігольная ф-ка, шчацінная і інш.) няма агэнцтваў ашчадкас, на тых-жа, дзе маюцца агэнцтвы, няма кантрольных лічбаў па ашчадсправе. Брыгады выявілі поўную бязьдзейнасьць камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, якія займаюцца толькі выдачай дазволаў на продаж і заклад пазык, не ўдзеляючы ніякай увагі ашчадсправе.

Характэрна адзначыць, што брыгаду якая зьявілася на бровары ны завод для праведзеньня працы па ашчадсправе, выгналі з заводу.

Праца брыгад прымусіла ўзварушыцца мясцовыя організацыі, яны прынялі ўдзел у разьвіцьці ашчадсправы, адначасова дапамаглі палепшыць працу ашчадапарату.

10 комсамольцаў—у ашчадапарат

Гарком мобілізаваў на сталую працу ў ашчадапарат 10 лепшых комсамольцаў-ударнікаў з вытворчасьці. Комсамольцы скарыстаны на кіруючай працы (заг. аддзяленьнем, прып. касамі і інш.) Кандыдатуры вылучаных комсамольцаў былі абгаворваны комсамольскімі ячэйкамі і рабочымі колектывамі.

Папаўненьне апарату 10 комсамольцамі дало магчымасьць Гаркому організаваць самастойную ячэйку ашчадкас, што дапаможа пасьпяховаму вырашэнню пытаньняў, зьвязаных з працай ашчадкас.

Над ашчадапаратам няма яшчэ рабочага шэфства. Рабочыя абутковай фабрыкі, якія шэфствуюць над ашчадкасамі, нават ня ведаюць аб тым, што яны зьяўляюцца шэфамі. Ініцыятыва комсамольскай ячэйкі і тут дала штуршок. Спэцыяльна склікаены адкрыты партсход абутковай ф-кі з удзелам рабочых па дакладу заг. райкасай прыняў шэраг практычных рашэньняў па шэфству і паляпшаньню працы ашчадкас.

Разгортваюць працу

Ячэйкі на мясцох вылучылі брыгады, якія праводзяць растлумачальную працу сярод рабочых, уцягваючы іх у ашчадкасы і растлумачваючы сутнасьць і тэхніку запаўненьня блянкаў па безнаяўных разьліках. У гэтай працы дапамагаюць піонэры,

На бюро і агульных сходах ячэяк заслухоўваюцца справаздачы падшэфных ашчадкас, прымаюцца практычныя прапановы і ў прыватнасьці па ўкомплектаваньню ашчадкас лепшымі комсамольцамі. На тых прадпрыемствах, дзе не арганізованы самастойныя ашчадкасы, ячэйкі вылучаюць комсамольцаў-агентаў ашчадкас.

З удзелам „лёгкай кавалерыі" ячэйкі організуюць праверку дзейнасьці ашчадкас, адносіны грамадзкасьці да ашчадсправы, вядучы барацьбу з валакітай, бюрократызмам, чаргамі і закаранеласьцю грамадзкіх організацый у гэтай справе. Лёгкая кавалерыя павінна ня толькі правяраць, але дапамагчы палепшыць працу ашчадкас і стварыць вакол не грамадзкую думку.

Дзьвіна ўперадзе

Па ініцыятыве і настойлівасьці комсамольскага колектыву фабрыкі „Дзьвіна" на ф-цы організавана першая ў Віцебску комсамольская ашчадная каса.

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Дзьвіна" правёў перад гэтым значную працу. Вылучаныя комсамольскія работнікі двое сутак праводзілі па ўсіх цэхах і зьменах індывідуальныя гутаркі, лятучыя сходы, скарыстоўвалі перапынкі і сходы па перавыбарам горсаветаў.

Урачыстае адчыненьне комсамольскай ашчадкасы, праведзенае ў клюбе ф-кі, перапоўненым моладзьдзю і дарослымі рабочымі, вылілася ў дэмонстрацыю гатоўнасьці ўсёй рабочай масы ф-кі падтрымаць ініцыятыву комсамолу.

Даклад аб ашчадсправе і задачах комсамолу, рапарты паасобных ячэек аб праробленай працы з ілюстрацыяй гэтага лічбамі, выклікі рабочых на дадатковую падпіску па пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады," даўшыя за адзін вечар 4.200 руб., уступленьне ў ашчадкасы, вылучэньне заг. комсамольскім аддзяленьнем ашчадкасы, прыняцьце двухбаковага наказу ячэйкі і комсам. ашчадкасы, прывітаньне кіруючых і мясцовых партпрофорганізацый—забясьпечылі шырокую грамадзкую думку вакол пачыну комсамолу на ашчадным фронце.

На дапамогу вясковым ячэйкам Гарком накіраваў у с-саветы 5 комсамольцаў. Комсамольцы на вёсцы правялі значную працу. Брыгада па Даўжанскім с-с. рэалізавала пазыкі на 2.700 р., уцягнута 120 укладчыкаў, з якіх 100 укладчыкаў сялянскіх на 1.719 руб.

Скарыстаць вопыт

Пры Віцебскім Гаркоме КСМ організавана сталая тройка, якая павінна стаць сэктарам ашчадсправы пры Гаркоме. Тройка павінна правяраць і дапамагаць ячэйкам у працы, а таксама стварыць сталы актыў добраахвотнікаў—комсамольцаў для разгортваньня ашчадсправы.

Пачатак ёсьць. Віцебскі комсамол практычна ажыцьцяўляе дырэктывы партыі на важнейшым вучастку соц. будаўніцтва—ашчадсправы.

Вопыт Віцебску павінен быць падхоплены ўсім організацыямі.

Шымшалеў ч Жукаборскі

Пераключым усе вольныя сродкі ў домны, варштаты, машыны

Сіроцінскай організацыі не датычыць

Ня гледзячы на пастанову ЦК ЛКСМБ аб удзеле комсамольскіх організацый у мобілізацыі вольных сродкаў праз ашчадкасы, сіроцінская комсамольская організацыя зусім ня лічыць патрэбным займацца гэтай справай.

Увесь удзел організацыі выявіўся ў тым, што ў дэкаду мобілізацыі сродкаў частка комсамольцаў спаганяла абавязковыя плацяжы. Дырэктыва ЦК ЛКСМБ ад 27-ХІ не даведзена да ячэяк.

Сэкратар РК ЛКСМ лічыць, што мобілізацыяй сродкаў няма часу займацца.

10-І—31 г. на сходзе раённай ячэйкі ЛКСМБ адзначалі, што ня толькі адна гэта пастанова ЦК ЛКСМ аб мобілізацыі сродкаў прашла міма ўвагі Сіроцінскай комсамольскай організацыі.

ЦК ЛКСМБ трэба праверыць працу Сіроцінскай комсамольскай організацыі.

С—ч.

Выкарыстаць вопыт Дуброўны

Дубровенскім РК ЛКСМБ разгорнута вялікая праца па мобілізацыі сродкаў праз ашчадкасы. На ўсіх комсам. яч. абмяркоўваюцца пытаньні ашчадсправы для ўцягненьня комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ўкладчыкамі ашчадкас. На сталую працу ў ашчадкасы вылучаны 4 комсамольцы.

Дубровенская організацыя ўступіла ў спаборніцтва з Лядвянскай організацыяй КСМ, узяўшы на сябе наступныя аб…зацельствы:

Правесьці шырокую растлумачальную працу аб ашчадсправе сярод комсамольцаў і беспартыйнай батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі пад лёзунгам: „кожнаму комсамольцу ашчадкніжку". Акрамя таго, кожны комсамолец на працягу студзень-сакавік павінен завербаваць ня менш 5 укладчыкаў з сумай укладаў ня меней 10 руб.

Кожны комсамолец атрымлівае пэнсію праз ашчадкасу.

Кожная ячэйка вылучае ўпаўнаважаных па ашчадсправе, якія прыцягнуўшы актыў комсамолу і працоўную моладзь, організуе падворныя абходы для вярбоўкі ўкладчыкаў у ашчадкасы.

Організацыя ўзяла на сябе абавязак рэалізаваць праз ашчадкасу 20 швейных машын 5-й партыі.

У 5 с/саветах, дзе няма сталых ашчадкас, Райком вылучае 5 комсамольцаў для працы па сумяшчэньню.

Для сталай праверкі працы і дапамогі ячэйкам пры Райкоме складзен сэктар ашчаднай справы. Сэктар кіруе працай ячэяк у галіне ашчаднасьці, заслухоўваючы справаздачы сэкратароў і ўпаўнаважаных па ашчадсправе. Вакол сэктару ў ашчаднай справы створана інструктарская група ў колькасьці 10 комсамольцаў-актывістых, якая правярае працу ячэяк у напрамку выкананьня соцумовы, складзенай з Лядвянскай організацыяй.

Інструктарская група выяжджае таксама ў с/с для даведзеньня кантрольных лічбаў па ашчадсправе да вёсак і насельных пунктаў і організацыі працы ячэяк у галіне ашчадсправы.

Соцумова складзеная на час студзень-сакавік будзе штомесячна правярацца організацыямі. Комсамольскія ячэйкі бяруць шэфства над ашчадкасамі, дапамагаюць і пэрыодычна правяраюць працу ашчадкас, вядучы барацьбу з бюрократызмам і цягавінай.

Дубровенскі комсамол практычна ўзяўся выконваць дырэктывы партыі і комсамолу аб мобілізацыі сродкаў.

Прыклад Дубровенскай організацыі павінны падхапіць усе астатнія організацыі.

Ш---іч.

Арбітр „Чырвоная Зьмена"

Райком ЛКСМБ, ажыцьцяўляючы дырэктыву ЦК ЛКСМБ узяў шэфства над райашчадкасай. Ён абавязваецца ўзмацніць працу па мабілізацыі сродкаў шляхам уступленьня комсамольцаў і ўцягненьня ўкладчыкамі ў ашчадкасу сялянства. Райком распрацаваў кантрольныя лічбы для кожнай ячэйкі.

Будуць мобілізаваны 4 чалавекі на сталую працу ў апарат ашчадкасы. Высылаюцца спэцыяльныя брыгады па ўсіх сельсаветах для мобілізацыі сродкаў шляхам падворных абходаў.

Пухавіцкі райком выклікаў на спаборніцтва Чэрвеньскую райорганізацыю.

Арбітрам абрана „Чырвоная Зьмена".

Выкананьне соц. дагавору ўжо праводзіцца ў жыцьцё. Новасёлкаўская ячэйка завербавала 40 укладчыкаў, на суму 350 рублёў.

Рэшта ячэек павінна пасьледваць прыкладу гэтай ячэйкі.

Лявенкаў.

Расьнянскі райком бязьдзейнічае

Расьнянскі РК бязьдзейнічае ў адносінах мобілізацыі сродкаў насельніцтва.

Ніводная ячэйка раёну не організавала комсамольскіх брыгад для падворных абходаў па ўцягненьню ўкладчыкаў у ашчадкасы. Адзін сакратар ячэйкі напісаў у РК, што ён ня мае магчымасьці склікаць комсамольцаў сваёй ячэйкі, а значыць ня можа праводзіць працы па мобілізацыі сродкаў. Райком на гэта не рэагаваў.

Райком не мобілізаваў комсамольскую організацыю на выкананьне дырэктывы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі сродкаў.

Такія адносіны РК да важнейшай політычна-гаспадарчай задачы павінна атрымаць належную ацэнку з боку кіруючых органаў.

Стаўка на самацёк, недаацэнка політычнай важнасьці ашчадсправы—вось што характарызуе працу райкому ў гэтай галіне.

ЦК комсамолу павінен адпаведным чынам рэагаваць на бязьдзейнасьць Расьнянскага комсамолу ў галіне мобілізацыі сродкаў і разьвіцьця ашчадсправы.

Сноўскі.

ДАМО 40.000!

Соцдагавор па выпісцы „Чырвонай Зьмены" поўнасьцю ня выкананы.

Упаўнаважаныя, праверце выкананьне тыражна-кантрольных лічбаў.

„Чырвоную Зьмену" павінен чытаць кожны комсамолец.

НА ШТУРМ ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА, РАШАЮЧАГА

Рэалізуем адозву IX зьезду УсеЛКСМ

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ

Сем год працы над выкананьнем ленінскіх запаветаў былі гадамі работы і барацьбы партыі і рабочае клясы за пабудову соцыялізму ў нашай краіне. Высока трымае сьцяг Леніна бальшавіцкая партыя, вядзе пераможнае наступленьне соцыялізму па ўсім фронце, зьнішчаючы рэшткі капіталізму ў нашай краіне.

Гэтыя посьпехі сталі магчымымі дзякуючы рашучай барацьбе партыі і рабочае клясы з усялякімі опортуністычнымі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым опортунізмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, і „левымі" фразёрамі праводзячы ў жыцьцё ленінскае вучэньне.

Посьпехі, якія мы маем у справе соцыялістычнага будаўніцтва,—індустрыялізацыя краіны і рэконструкцыя сельскай гаспадаркі,—вырашаюць ленінскае пытаньне „хто каго" на карысьць соцыялізму, высокія тэмпы соц. будаўніцтва пры нябывалым росьце энтузіязму рабочых мас, соц. спаборніцтва, ударніцтва, прадрашаюць пытаньне аб заканчэньні пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР у 1931 г

У гэтых гарачых днёх барацьбы за соцыялізм ленінскі комсамол зьяўляўся і зьяўляецца лепшым і першым дапаможнікам комуністычнай партыі і, пад яе кіраўніцтвам сваёй барацьбой і работай з гонарам апраўдаў узятае на сябе імя Леніна. Комсамол мае шмат посьпехаў па ўдзелу ў соц. будаўніцтве, але яшчэ больш работы стаіць уперадзе, на шляху соцыялістычнага будаўніцтва.

Адозва 9-га зьезду УсеЛКСМ заклікае ўсю рабоча-сялянскую моладзь усю армію ленінскага комсамолу Савецкай краіны да новых перамог у соцыялістычным будаўніцтве. Для выкананьня гэтай адозвы ЦК ЛКСМБ заклікае ленінскі комсамол і рабоча-сялянскую моладзь БССР мобілізавацца на штурм за высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны за рэконструкцыю сельскай гаспадаркі і, на базе суцэльнай колектывізацыі—ліквідацыю кулацтва як клясы, на барацьбу за генэральную лінію партыі супроць правых і „левых" опортуністых, права-„лявацкага" блёку і прымірэнцтва да іх, за поўнае выкананьне вытворчае праграмы 3-га, рашаючага году пяцігодкі, за пагалоўнае ўступленьне ва ўдарныя брыгады, за 100 проц. уступленьне рабочае моладзі ў комсамол. У выкананьне адозвы ЦК ЛКСМБ прапануе:

1) Райкомам і ячэйкам організаваць распрацоўку адозвы IX зьезду на сходах ячэек, на нарадах актыву, на конфэрэнцыях рабочае моладзі, праводзячы ленінскі заклік пад лёзунгам „100 проц. удзелу комсамольцаў ва ўдарных брыгадах", падымаючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень у аўладаньні вышынямі плянаваньня і рацыяналізацыі.

2) Вясковы комсамол павінен яшчэ больш павялічыць тэмпы работы па правядзеньню суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі на яе базе кулацтва як клясы. Адозва заклікае ўсіх комсамольцаў вёскі ўступіць у колгасы. Гэта павінна быць выканана. Комсамольская організацыя павінна сваечасова падрыхтавацца да вясновай сяўбы, каб за час вясновай сяўбы ўцягнуць у колгасы 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а да канца 31 году—45 проц. Прыняць рашучыя крокі замацаваньня існуючых колгасаў, да організацыі працы ў колгасах, разгортваньня ўдарніцтва і соцспаборніцтва.

3) ЦК прапануе зараз-жа, на падставе распрацоўкі адозвы, разгарнуць працу па закліку ў шэрагі КСМ маладых рабочых, работніц, лепшых маладых колгасьнікаў. колгасніц, адначасова разгарнуўшы шырокую вярбоўку рабочых ударнікаў, колгасьнікаў у шэрагі партыі.

4) ЦК прапануе ўсім РК і ячэйкам шырока прыцягнуць да выкананьня адозвы піонэрскія організацыі, яшчэ больш павялічыўшы яе практычны ўдзел у соцбудаўніцтве, адначасова зрабіўшы заклік у шэрагі піонэрорганізацыі дзяцей рабочых, колгасьнікаў, батракоў і беднякоў.

5) Прапанаваць „Чырвонай Зьмене" сыстэматычна асьвятляць ход выкананьня адозвы, усім РК кожную дэкаду інформаваць ЦК аб ходзе выкананьня гэтай работы.

6) На чарговым бюро ЦК заслухаць даклады шэрагу РК па выкананьню гэтае пастановы.

7) Пастанову апублікаваць у друку.

1-я Ўсебеларуская конфэрэнцыя ФЗВ-вучняў

Грамадзка-палітычнае выхаваньне—на вышэйшую ступень

3-ці дзень працы конфэрэнцыі пачаўся дакладам тав. Рацэвіча. Тав. Рацэвіч у сваім дакладзе па пытаньню становішча грамадзка-палітычнага выхаваньня ў школах ФЗВ адзначыў, што наша моладзь, якая жыве і расьце пад кіраўніцтвам ленінскага комсамолу, праяўляе вялічэзны энтузіязм і гэроізм у барацьбе за пяцігодку. Ён прыводзіць прыклады з гэроічнай дзейнасьці нашай працоўнай моладзі, і як аб гэтым адзываецца замежная буржуазная прэса.

Далей тав. Рацэвіч спыняецца на дакладзе Белмэтальаб'яднаньня, які зьяўляецца працягваньнем опортуністычных установак у пытаньнях барацьбы за кадры. У сваім дакладзе,—кажа далей тав. Рацэвіч,—тав. Крыштафук звальвае ўсю віну за дрэннае становішча ФЗВ на комсамол, даводзіў сваю тэорыю, што ўсе павінны адказваць за ФЗВ, усе зінаваты ў яго дрэнным становішчы.

Грамадзка-палітычае выхаваньне ў школах ФЗВ яшчэ да гэтага часу не пастаўлена на належную вышыню. Соцспаборніцтва ня стала мэтодам штодзеннай працы ФЗВ, барацьбы за найлепшыя паказчыкі. Школа ФЗВ яшчэ ня стала цэхам заводу. Комсамольскія ячэйкі на мясцох недастаткова кіруюць і дапамагаюць у працы ФЗВ.

Далей тав. Рацэвіч спыняецца на становішчы інтэрнацыянальнай працы і антырэлігійнага выхаваньня.

У спрэчках выступіла шмат дэлегатаў. Большасьць выступаючых адзначыла дрэнную пастаноўку палітвыхаваўчай працы ў фабзавучы, адсутнасьць палітгурткоў і іншых форм паліт- адукацыі. Насьценгазэты ня сталі зброяй барацьбы з усімі недахопамі шляхам шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі.

У сваім заключным слове тав. Рацэвіч адзначыў неабходнасьць сумеснай працы комсамолу ФЗВ з усім заводзкім колектывам, недапушчальнасьць адрыву і замкнутасьці ў працы ФЗВ.

Пасьля заключнага слова пачалі сваю працу вытворчыя і акадэмічныя сэктары конфэрэнцыі.

Ціхон Палын

Юнкораўскі пост: Бар. Ліўшыц

Г. Грачоў

Ад першай конфэрэнцыі школ ФЗВ мэталістых і электрычнай прамысловасьці шчырае прывітаньне Цэнтральнаму Органу ЛКСМБ—газэце „Чырвоная Зьмена"

На сваіх старонках „Чырвоная Зьмена" вяла рэгулярную барацьбу за ФЗВ, як за асноўную форму падрыхтоўкі кадраў.

Усебеларуская конфэрэнцыя ФЗВ запэўнівае ЦК ЛКСМБ і яго орган „Чырвоную Зьмену", што пастаўленыя партыяй перад ФЗВ задачы будуць выкананы.

Няхай жыве КП(б)Б!

Няхай жыве ЛКСМБ і яго орган —„Чырвоная Зьмена"!

Першая ўсебеларуская конфэрэнцыя школ ФЗВ.

Касьцлявая рука голаду душыць мільёны працоўных

Дзесяткі тысяч рабочых экономічным крызісам выкінуты на вуліцу

51 самагубства ў Лодзі за адзін дзень

ВАРШАВА, 20.—Яўрэйская газэта „Фольксцайтунг" паведамляе з Лодзі, што за ўчарашні дзень наканечылі самагубствам 51 беспрацоўных.

Трое змораных голадам беспрацоўных падабраны на вуліцы ў няпрытомнасьці.

Масавыя выступленьні працоўных у Радаме

ВАРШАВА. 23. Выступленьні беспрацоўных у Радаме, прынаўшыя масавы і надзвычайна жорсткі характар, працягваліся некалькі дзён. Беспрацоўныя забіралі харчы ў крамах, затрымлівалі вазы з харчамі і хлебам і ў некалькіх выпадках, калі ім аказвалася супраціўленьне, яны разбуралі крамы. Ня гледзячы на паліцэйскія мерапрыемствы, у апошнія дні выступленьні беспрацоўных аднавіліся. Зноў адбыліся ярасныя сутычкі з паліцыяй. Распачынаецца справа „аб супраціўленьні ўладзе".

Масавыя дэмонстрацыі ў Варшаве

ВАРШАВА, 23.—У дзень сьмерці Леніна, Лібкнэхта і Люксэмбург у Варшаве адбыліся 4 масавыя дэмонстрацыі пролетарыяту. Дэмонстрацыі ўсюды былі разагнаны. У Лодзі ў рабочых раёнах гораду і каля біржы працы таксама адбыліся дэмонстрацыі рэволюцыйных рабочых. Комуністычнаму дэпутату, тав. Данецкаму, удалося прабрацца ў памяшканьне біржы працы і выступіць перад беспрацоўнымі з прамовай. Аднак, награнуўшая паліцыя разагнала мітынг.

Бэрнлі — горад жабрацтва

ЛЁНДАН. 23.—Рыхтуючыся да працяжнай барацьбы, Ланкаширскія тэкстыльшчыкі зьвярнуліся да ўсіх рабочых організацый с просьбай аб падтрыманьні. У органе ангельскай компартыі „Дэйлі Уоркер" апублікавана адозва цэнтральнага стачачнага камітэту гораду Бэрнлі, які заклікае дапамагаць бастуючым продуктамі, вопраткай і грашыма, адзначаючы, што „Бэрнлі—горад узрушаючага жабрацтва".

Ад голаду загінула звыш мільёна 600 тысяч чалавек

ШАНХАЙ,—Па афіцыйных вестках, у Нанкіне налічваецца 300 тысяч беспрацоўных. У провінцыі Хэнань налічваецца 200.000 беспрацоўных. Акрамя таго, маецца ня менш 100.000 дэмобілізаваных салдат са зволеных чыноўнікаў, якія ня маюць работы.

У провінцыі ад голаду і недароду загінула разам звыш 1 мільёна 600 тысяч чалавек.

„Дайце работы і хлеба"

ВЕНА,—У Сэгэдэне (Вэнгрыя) 14-га студзеня адбылася бурная дэмонстрацыя беспрацоўных, якія абкружылі ратушу і крычалі: „Дайце работы і хлеба!"

Паліцыя ацапіла дэмонстрантаў і напала на іх з шашкамі нагала. Многія беспрацоўныя арыштаваны і адданы пад суд па абвінавачваньню ў падбухторваньні і супраціўленьні ўладзе.

Чатыры тысячы друкароў забаставалі

НАРЫЖ, 19.—Па паведамленьню агенцтва Гавас з Мадрыда там пачалася забастоўка друкароў, якая ахоплівае 4000 рабочых. Забастоўкай не закрануты друкарні, якія выпускаюць газэты.

20 мільёнаў беспрцоўных у Эўропе і Амэрыцы

ЖЭНЭВА, 23.—Міжнароднае бюро працы пры Лізе Нацый у Жэнэве апублікавала справаздачу аб становішчы сусьветнага беспрацоўя. Па бязумоўна прыўменшаных даных бюро працы, лік беспрацоўных ва ўсім сьвеце складае 20 мільёнаў, у тым ліку ў Эўропе—11 мільёнаў, а ў астатніх краінах—усяго толькі 9 мільёнаў, ня гледзячы на тое, што апошняя лічба яўна не адпавядае сапраўднасьці, з усяго гэтага відаць, што нават буржуазныя крыніцы вызначаюць колькасьць беспрацоўных у адных толькі Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі 8-10 мільёнаў. Бюро працы вымушана прызнаць, што ў Эўропе беспрацоўе ўзрасло ў два разы ў параўнаньні з мінулым годам.

Лік беспрацоўных па прыўменшаных даных бюро працы складае ў Нямеччыне 4 з паловай мільёны, у Ангельшчыне—2 з паловай мільёны, у Італіі—больш поўмільёна, у Польшчы—200 тысяч, Чэха-Славакіі—каля паўтараста тысяч.

Фашысцкія мэтоды вярбоўкі

У горадзе Арэштанд (Нямеччына) чыноўнік крымінальнай паліцыі Штройбер прапанаваў маладому рабочаму, адбыўшаму тэрмін „прымусовага выхаваньня", уступіць у шэрагі нацыянал-соцыялістых (фашыстых). Рабочы наадрэз адмовіўся. Тады Штройбэр прыгразіў яму паўторным зьняволеньнем.

Абураны рабочы напісаў аб гэтым выпадку ў комуністычную газэту „Турынгер Фольксблят", якая выкрыла на сваіх старонках агідныя ўчынак чыноўніка-фашыстага.

І хаця ў рэдакцыі комуністычнай газэты ёсьць дакументы, якія пацьвярджаюць заяву рабочага, усё-ж соцыял-дэмократы праз сваю газэту паўсталі гарой на абарону Штройбэра. Яны называюць выкрыцьцё „Турэнгар фольксблят" „выдумкай комуністых".

Паштовая скрынка

Хаціну—„Прыклад усім", Красоўскаму—„Адна з лепшых", Фішкінду і Шыфрыну—„Аб пяцідзёнцы „Чырвонай Зьмены", Хвалі—„Ня чытаюць газэт", Грыганаву—„Усе выпісваем газэты", Бертніковічу—„Аб падпісцы на газэты", Цырэльсону—„Аб пяцідзёнцы распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены". Анісімаву—„Рыхтуемся да прапрацоўкі", Левіну—„Комсамольская ячэйка комуны „Сеяцель слаба працуе", Янкаўцу—„Падпісаліся на 1 экзэмпляраў", Феськаву—„Выклікаем на спаборніцтва", Дубоваму—„Насьценная газэта не працуе", Саўкову—„Чаму не даставілі газэт",—вышэйпералічаныя допісы ня пойдуць з-за дробязнасьці і ўстарэлазьці фактаў і адсутнасьці дакладных адрасоў. Частка з іх накіравана для рэагаваньня.

Паведамленьні

Краснапольскі РК КП(б)Б і РКК-РСІ паведамляе ўсіх рабкораў, селькораў, насьценкораў і юнкораў, што ў нядзелю 1-га лютага г. г., а 10 гадзіне дня, у памяшканьні Краснапольскага Нардому адбудзецца раённая конфэрэнцыя рабселькораў, на якую запрашаюцца ўсе рабселькоры раёну.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб вясеньняй пасеўкампаніі і задачах рабселькораў;
2. Работа РКК-РСІ і ўдзел рабселькораў.

РК КП(б)Б і РКК-РСІ

Сёньня, 26-га студзеня а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні аддзяленьня (Савецкая, 61) Беларускага Прадстаўніцтва „Комсомольской Правды" склікае нараду юнкораў „Комсомольской Правды" і цэнтральных газэт.

Запрашаюцца ўпаўнаважаныя „Ком. Правды", а таксама чытачы.

Пасьля нарады колектыўнае наведваньне кіно.

З прычыны важнасьці пытаньня просьба не спазьняцца.

Беларускае прадстаўніцтва „Комсомольской Правды"

27-га студзеня г.г., а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі „Беларуская Вёска" склікаецца нарада на пытаньню спэцыялізацыі раёнаў БССР.

На гэту нараду запрашаюцца т.т. Рачыцкі, Масюкоў Бондар і Паніматка (НКЗ), Міцькоў, Самусевіч і Залескі (Белколгасцэнтр) Маргелаў (БАН) і Ганін (НДІ).

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599